В отдельных регионах был введен ряд местных налогов. Например, в западных областях Белоруссии налогом облагались даже кошки [2; 278].

1. Государственный архив Брестской области. Ф. 2120. Оп. 1. Д. 8.
2. Обзор мероприятий германских властей на временно оккупированной территории, подготовленный на основе трофейных документов, иностранной печати и агентурных материалов, поступивших с июня 1941 г. по март 1943 г. // Неизвестная Россия. XX век. Кн. IV - М.: Московское городское объединение архивов, 1993. – С. 235 – 330.

*Харытановіч С. С (г. Брэст, БГТУ)*

## ОСТАРБАЙТЭРЫ З ПІНШЧЫНЫ: АХВЯРЫ ВАЙНЫ

Акупаваны нямецкімі войскамі 5 ліпеня 1941 года горад Пінск і наваколле былі ўключаны ў генеральны округ "Валынь – Падолія" (рэйхскамісарыят "Украіна") і атрымалі статус округа. У Пінску, які стаў цэнтрам округа, быў створаны акружны камісарыят (гэбіцкамісарыят) – орган, кантралюючы ўсё грамадзянскае кіраванне. На чале яго стаў акружны камісар Паўль Герхард Кляйн. Гебіцкамісарыят складаўся з шасці аддзелаў: адміністрацыйнага, фінансавага, гаспадарчага, харчовага, працоўнага і палітычнага. 6 ліпеня 1941 года акупацыйныя ўлады аператыўна сфарміравалі орган грамадзянскай улады – "Пинское Городское Управление (магистрат)", кіраўніком якога быў пастаўлены бургамістр С. Кірылаў. Паралельна з грамадзянскай адміністрацыяй на тэрыторыі Пінскага округа дзейнічаў паліцэйскі і ваенны апарат.

Становішча на ўнутраным германскім працоўным фронце летам 1941 года было далёка не такім станоўчым, як на ваенным. Упрауленне ваеннай эканомікі і зброі паведамляла аб 800-тысячнай "дзірке" ў працоўным балансе адной толькі ваеннай эканомікі [9, 52] 7 лістапада 1941 года адбылася нарада "Аб выкарыстанні рускай рабочай сілы" з удзелам Герынга [5, 639]. 19 снежня 1941 года дзяржаўны міністр для занятых усходніх абласцей выдае дырэктыву, па якой жыхары гэтых абласцей ва ўзросце ад 18 да 45 год падлягаюць "публичной трудовой повинности". Невыкананне гэтага распараджэння караецца арыштам або турмой. Справы падсудны асобным судам [1]. Спачатку меркавалася, што да насельніцтва ў так званых "новых абласцях", анэксіраваных СССР у 1939 – 1940 гадах, трэба адносіцца больш-менш лаяльна. Былі прапановы не вербаваць, а як бы адкамандзіроўваць людзей з забеспячэннем харчавання, кішэнных грошаў і грашовай дапамогі для застаўшайся дома сям'і. Па такой схеме працаўладкаваліся каля 10-12 тысяч украінскіх гарнякоў у германскай горназдабычы. Але ў гэтым сэнсе паказальна дырэктыва ад 28 ліпеня 1941 года, у якой гаварылася, што генерал-фельдмаршал Кейтэль не задаволены тым, што ў наваколлі Львова мясцовым рабочым выплочваюць зарплату ў памеры 25 рублёў. "На русской территории должны использоваться другие правила, чем в Западной Европе" [9, 52].

31 снежня 1941 года гэбіцкамісарам г. Пінска і Пінскай акругі Кляйнам былі падпісаны "Временные правила для исчисления налогов на 1942 год". Гэтая сістэма павінна была ўпарадкаваць адміністрацыйнае і гаспадарчае жыццё. Адначасова мелася добрая магчымасць правесці рэгістрацыю ўсяго, у тым ліку і працаздольнага насельніцтва.

10 студзеня 1942 года выйшлі два загада. Першы – Гітлера, які афіцыйна зафіксаваў пераход да канцэпцыі доўгатэрміновай вайны. Другі – Герынга, які паведамляў, што "в течение ближайших месяцев использование рабочей силы приобретает еще большее значение" [5, 639]. Ведамства па чатырохгадоваму плану выдала кантрольную лічбу вярбоўкі рускіх грамадзянскіх асоб для патрэб Рэйха – 200 тысяч асоб. Прадугледжвалася "класічная", гэта значыць дабраахвотная, вярбоўка [9, 52].

Для падрыхтоўкі і правядзення мабілізацыі насельніцтва міністэрства прапаганды выпусціла: 398 тысяч плакатаў, 7 невялікіх брашур тыражом 700 тысяч экзэмпляраў, лістовак –

1870 тысяч. Праводзілася каля 3 тысяч выстаў, былі падрыхтаваны два спецыяльных фільма, два другіх здымаліся [5, 774]. Выдаваўшаяся з 8 ліпеня 1942 года акупацыйнымі ўладамі на ўкраінскай мове "Піньска газета" змяшчала прамыя заклікі да насельніцтва ехаць працаваць у Германію [7]. Дабраахвотная мабілізацыя праводзілася з размахам. Як сродак агітацыі выкарыстоўваліся публікацыі лістоў людзей, якія ўжо працавалі ў Германіі. Але разлікі на дабраахвотнасць не апраўдаліся. Фрыц Заўкель – гаўляйтар Цюрынгіі, які 21 сакавіка 1942 года быў прызначаны генеральным упаўнаважаным па працоўным рэсурсам, прызнаваў, што "из 6 миллионов иностранных рабочих едва ли наберется 200 тысяч добровольно согласившихся ехать на работу в Германию" [5, 680].

21 снежня 1942 года Розенберг пісаў у лісце Заўкелю: "Отчёт, который я только что получил, показывает, что рост партизанской деятельности в оккупированных восточных районах объясняется, главным образом, тем фактом, что методы, которые применяются для добывания рабочей силы в этих районах, являются насильственными методами массового угона. Люди, таким образом, могут избежать своей судьбы только тем, что уходят в леса и вступают в партизанские отряды» [5, 710].

Згодна з архіўнымі дадзенымі, менавіта з вясны 1943 года пачынаецца масавы вываз насельніцтва Піншчыны на прымусовую працу ў Германію, прычым праводзіўся ён самымі вар'яцкімі метадамі. 19 сакавіка 1943 года ў загадзе па вайсках СС гаварылася: "Если есть необходимость, следует сжигать деревни, а всё население должно быть предоставлено в распоряжение начальника по набору рабочей силы" [5, 711].

Прычынамі такой змены палітыкі нямецкіх акупацыйных улад у адносінах да метадаў вярбоўкі насельніцтва на працу ў Германію вясной 1943 года з'яўляецца паражэнне нямецкіх войск пад Сталінградам, недахоп таннай рабочай сілы і неэфектыўнасць дабраахвотнай працоўнай мабілізацыі. Трэба таксама мець на ўвазе, што ў гэты перыяд значна пашырыўся патызанскі рух на акупаванай тэрыторыі.

Захавалася форма загада, які распаўсюджвалі ў вёсках Пінскага раёна, жыхары якіх падлягалі перасяленню ў Германію для працы у сельскай гаспадарцы. Насельніцтву гаварылася, што "за оставленное имущество ручается Германское государство, которое возвратит его по окончании войны". Фактычна, за гэтым пунктам загада стаяла тое, што большасць вёсак спальвалі, каб маёмасць не засталася партызанам, а таксама, каб людзі не імкнуліся вяртацца і не супрацiўляліся ад'езду.

Жыхарам Пінска, якія павінны былі ехаць на працу ў Германію, дасылаўся "призывной приказ": "Вы должны явиться (дата) в 7 часов утра на приёмочный пункт по улице Театральной, 8 в связи с отбытием в Германии своей 2-летней трудовой повинности. Отбор и медицинский осмотр будет производиться в приёмочном пункте. Принести с собой: документы, рабочую одежду, крепкую обувь, бельё и продовольствие на 4 дня. В случае невыполнения этого приказа Вы и Ваша семья будут принудительным порядком доставлены в жандармерию" [2].

Нават у 1944 годзе, калі ваенная ініцыятыва канчаткова перайшла да СССР, калі да вызвалення Беларусі заставаліся лічаныя месяцы, вываз у рабства мясцовага насельніцтва не прыпыняўся.

Мемарандум ад 12 чэрвеня 1944 года, знойдзены ў паперах Розенберга, прадугледжваў: "Группа армий «Центр» намеревается захватить 40-50 тысяч подростков от 10 до 14 лет и направить их в рейх. Предполагается использовать их на немецких предприятиях в качестве подмастерьев и учеников. Эта мера направлена не только на предотвращение прямого пополнения численности армий противника, но на сокращение его биологического потенциала" [6, 337].

15 чэрвеня 1944 года выйшаў сакрэтны загад. Па Пінскай акрузе адказнасць за яго выкананне неслі акружное кіраўніцтва і працоўны аддзел горада Пінска. Загад прадугледжваў наступнае: "Истребление провести в боевом порядке с расчетом одновременного охвата двух,

трех деревень. Чтобы не допустить уход людей в леса, необходимо назначенные места под утро окружить и с наступлением дня провести истребление. Одновременно представители Рабочего Отдела и Окружного командования должны вручить повестки выделенным лицам и доставить их на сборные пункты Пинска и Янова. Работоспособной семьей считается та семья, где число работоспособных на 2 больше неработоспособных. Дети от 10 лет считаются работоспособными. До самой семьи принадлежат прадеды, деды, родители и дети, а также дяди, тетки и др., если работоспособны. Работоспособными считаются мужчины от 14 до 55 лет включительно и женщины от 14 до 50 лет... В районах, где находятся бандиты, работоспособные должны охраняться особыми частями. Целесообразно было бы, если бы комендатура приготовила транспорт для отправки людей на сборные пункты" [2].

У выніку за гады нямецка–фашысцкай акупацыі Піншчыны з чэрвеня 1941 па ліпень 1944 года ў няволю было ўгнана 10 782 чалавека: з горада Пінска – 6 373 чалавека, у тым ліку мужчын – 2 734, жанчын – 3 639; з Пінскага раена – 4 409 чалавек, у тым ліку мужчын – 1 973, жанчын – 2 436 [2]. За кожнай такой лічбай чалавечы лес. Да таго ж няма гарантыі, што яны поўныя. Апошні тэрмін вывазу насельніцтва на працу у Германію, які аўтар знайшоў па апытальных лістах, 11 ліпеня 1944 года, гэта значыць за тры дні, да вызвалення г. Пінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Транспарціроўка людзей на працу у Германію, згодна з успамінамі сведкаў, адбывалася па наступнай схеме: пад канвоем іх накіроўвалі у лагер у г. Пінск, дзе рабілі медыцынскі агляд, затым грузілі у таварныя вагоны па 50 – 80 чалавек. Пад час руху вагоны зачыняліся на замок, да таго ж іх суправаджалі нямецкія салдаты. У суткі на аднаго чалавека выдавалася каля 200 грамаў хлеба і паўлітра вады. Праз пяць-шэсць дзён остарбайтэры прыбывалі ў Германію. Далей адбывалася размеркаванне ў розныя галіны нямецкай эканомікі.

Тыя, хто працаваў у прамысловасці, жылі ў ахоўваемых арбайтлагерах за калючым дротам. Працавалі па 10-12 гадзін у суткі. У дзень атрымоўвалі па 200 грамаў хлеба і 500 грамаў супу з бруквы. Зарплата вагалася ад 15-20 да 40 марак у месяц. Абутак на драўлянай калодцы і адзенне атрымоўвалі за наяўны разлік. Акрамя таго існавала сістэма штрафаў і пакаранняў ад біцця палкамі да карцэра і адпраўкі ў канцлагер. [2] З успамінаў остарбайтэра: "...Из лагеря на завод направили как рабочего, снаряды делали, а за спиной надсмотрщик. Чуть резец запорешь – палкой по спине. Но вредили как могли, хотя и в концлагерь, на смерть могли отправить" [З архіва аўтара. – С. Х.].

У чэрвені 1944 года міністр узбраенняў Шпеер скардзіўся Гітлеру, што з заводаў кожны месяц уцякаюць 30-40 тысяч імперскіх рабочых [4, 295]. Уцекачоў змяшчалі ў канцлагера, каб выкарыстоўваць у якасці рабоў СС. Фактычна, з красавіка 1942 года стала ўжывацца тэорыя знішчэння працай. Прыбытак ад аднаго такога раба пры сярэдняй працягласці жыцця ў 9 месяцаў складаў прыкладна 1631 марку. У такіх жудасных падліках улічваліся нават выдаткі ад крэмацыі і дадатковы прыбытак ад выкарыстання касцей і пеплу [4, 296].

Яшчэ адной галіной нямецкай эканомікі, дзе шырока выкарыстоўвалася праца остарбайтараў, была сельская гаспадарка. Для атрымання работніка, работніцы або сям'і з Усходу баўэр павінен быў напісаць заяву на імя акружнога кіраўніка нацыянал-сацыялістцкай партыі і заплаціць пэўную суму грошай, прыкладна 10-15 нямецкіх марак за чалавека. Працоўны дзень працягваўся 12 гадзін. За працу атрымоўвалі 25-40 марак у месяц. Гэтыя грошы ішлі ў асноўным на набыцце адзення і абутку па спецыяльных картках. У дзень атрымоўвалі па 200-300 грамаў хлеба, раніцай і ўвечары – суп з бруквы [2]. Але трэба зазначыць, што ўмовы, у якіх жылі остарбайтэры, працуючы ў сельскай гаспадарці, не былі аднолькавымі для ўсіх, а часта залежылі ад гаспадароў, да якіх траплялі людзі. Нават у апытальных лістах "для возвратившихся на родину из германской неволи" ў графе "краткое изложение фактов издевательств, насилия, истязаний, побоев" даволі часта можна сустрэць: "Не было". У асноўным гэта тычыцца людзей, якія працавалі, менавіта, у сельскай гаспадарцы.

Што ж да правоў остарбайтэраў, акрэсленых у афіцыйных распараджэннях нямецкіх улад, то кожны рабочы з Усходу два разы ў месяц мог напісаць і адправіць ліст да родных. У раёнах з грамадзянскім кіраваннем – рэйхскамісарыяце Украіна і рэйхскамісарыяце Остлянд (Беларусь) – дазвалялася прымаць лісты і пакеты да 250 грамаў. Забараняліся малюнкі, скарачэнні, падкладкі. На кожным канверце або паштоўке трэба было ставіць сіні крыж. З 25 лістапада 1942 года дазвалялася дасылаць толькі паштоўкі з аплачаным адказам. Прыкладна з другой паловы 1943 года паток лістоў значна скараціўся. Остарбайтэрам забаранялася карыстацца чыгуначным, аўтамабільным і іншымі відамі грамадскага транспарту. Для іх не існавала паняцце "вольны час", забараняліся таксама шлюбныя адносіны. Такім чынам, становішча большасці остарбайтэраў можна параўнаць са становішчам нявольнікаў.

Згодна з абвінаваўчым актам Нюрнбергскага працэса, з тэрыторыі СССР германскія акупацыйныя ўлады прымусова вывезлі 4 978 735 чалавек грамадзянскага насельніцтва. З тэрыторыі Беларусі было вывезена каля 380 тысяч чалавек [9, 55].

*"Славяне призваны работать на нас. Когда же мы перестанем в них нуждаться, они могут преспокойно умирать. Поэтому немецкая система здравоохранения, обязательные прививки для них излишни. Размножение славян нежелательно. Они могут пользоваться противозачаточными средствами или делать аборты. Чем больше, тем лучше. Образование опасно. Вполне достаточно, если они смогут считать до ста. Мы можем им оставить религию как средство отвлечения. Что касается пищи, то они не должны получать ничего сверх того, что абсолютно необходимо для поддержания жизни. Мы господа. Мы превыше всего"* [6, 329]. Як бачым, словы Розенберга, міністра для занятых усходніх абласцей, ёміста адлюстроўваюць ту праграму мерапрыемстваў у адносінах да славянскага насельніцтва, якая была запланавана і праводзілася Трэцім рэйхам на справе. Але сітуацыя на фронце ўжо была не на карысць Германіі. Яе паражэнне ў вайне было толькі справай часу.

23 сакавіка 1945 года выйшаў загад аб сканцэнтраванні ўсяго насельніцтва разам з остарбайтэрамі і ваеннапалоннымі ў цэнтры рэйха. [9, с. 55] Магчыма, "остам" адводзілася яшчэ і роля жывога шчыта ад бомбавых удараў. Акрамя таго дзе-нідзе адбываліся і масавыя растрэлы людзей адступаючымі нямецкімі салдатамі. Так, 26 сакавіка 1945 года, за шэсць дзён да прыходу амерыканцаў, у лагеры Хірценхан былі расстраляны 81 жанчына ("остаўкі" і полькі) і шэсць мужчын [9, 54]. Такім чынам, остарбайтэрам у ліку іншых давялося спаўна зведаць усе жахі вайны.

Вяртанне на Радзіму пасля вызвалення для большасці былых інтэрніраваных савецкіх грамадзян праходзіла праз сетку спецыяльна створаных "сборно-пересыльных и проверочно-фильтрационных пунктов и лагерей НКВД".

Фактычна, дзяржава, зняўшы з сабе адказнасць за акупацыю значнай часткі сваёй тэрыторыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі, што дало магчымасць апошнім прымусова вывезці на працу ў Германію мільёны людзей, вялікую долю віны за гэта пераклала на рэпатрыянтаў. Яны яшчэ доўгія дзесяцігоддзі саромеліся ўспамінаць гэтую частку сваёй біяграфіі.


1. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 120. Оп. 1. Д. 8.
2. Філіял Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці ў г. Пінску. Ф. 118. Оп. 1. Д. 9, 34, 103, 120.
3. Безыменский Л. А. Разгаданные загадки третьего рейха: 1933-1941. - М., 1981. – 384 с.
4. Мельников Д. Е., Черня Л. Б. Империя смерти: Аппарат насилия в нацистской Германии: 1933-1945. - М.: Политиздат, 1989. – 457 с.
5. Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками. Сб. материалов в 7 т. Т. 3. - М., 1958. – 841 с.
6. Ширер У. Взлёт и падение третьего рейха. - М., 1991. Т. 2.
7. "Піньска газета" (орган окружного комісара в Піньску). 1943. № 26.
8. Земсков В. Н. К вопросу о репатриации советских граждан 1944-1951 гг. // История СССР. 1990. № 4.
9. Полян П. "OSTы" – жертвы двух діктатур // Родина. 1994. № 2.